4. Каля Акцябарскай васьмігадовай школы ў в. Копці перапахаваць загінуўшых воінаў з нядаўна знойдзеных пахаванняў у в. Зазыбы і Маклакі. Усяго 400 чалавек.

5. У в. Задзвінне (Пялёнкі) прывесці ў парадак і ўсталяваць помнік Герою Савецкага Саюза Гайко А. С.

**V. Дзеля ўвекавечання асабліва памятных месцаў, звязаных з баявымі дзеяннямі Савецкай Арміі, дзейнасцю падпольшчыкаў** трэба:

1. Усталяваць мемарыяльную дошку на будынку Віцебскага райкама КПБ у памяць пра загінуўшага сакратара падпольнага райкама КПБ Когаля В. І.

2. Ва ўрочышчы Пяскі (у 1, 5 км. ад в. Гарадняны), дзе гітлераўскія захопнікі праводзілі масавыя растрэлы мірных жыхароў г. Віцебска і падпольшчыкаў насыпаць курган, усталяваць абеліск.

3. Усталяваць абеліск на месцы бессмяротнага подзвіга 27 воінаў 158 сд, якія паўтарылі подзвіг герояў-панфілаўцаў у в. Друкава Варонаўскага с /с

**VI. Па прыкладу** калгаса імя Леніна, саўгасаў "Рудакова", Вароны і Бабініцкай сярэдняй школы **на тэрыторыі ўсіх калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў і школ** раёна **усталяваць абеліскі і насыпаць курганы ў памяць аб загінуўшых у баях за Радзіму земляках.**

**VII. Устанавіць дзеля турыстычных паходаў па партызанскіх тропах і месцах баявой славы маршруты**:

1. Ст. Лужасна–Вярхоўе–Чырвоны Двор–праз Трыніўкі–на былую в. Валконка–в. Шухвасты–Віцебск
2. Ст. Лужасна–Вярхоўе–Здраўнёва–Задзвінне–Плоты–Курына
3. В. Друкава–Дыманова–Шапуры–Узварцы–Віцебск

Такім чынам, выяўлены дакумент "Аб далейшай рабоце па ўвекавечанні гераічных подзвігаў савецкіх людзей ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны" выдадзены о 1966 г. не страціў сваё актуальнасці і 55 гадоў пасля яго публікацыі. Не ўсё з запланаванага па шэрагу прычын зроблена. Наша задача – давесці запланаванае да канца. Аднак, трэба ўлічваць тыя змены, якія адбыліся за мінуўшы час. Новыя рэаліі адрозніваюцца ад мінулага. Памянялася грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне. Няма больш краіны, якая выйграла вайну – СССР. Няма сацыялістычнага ладу. Скарацілася колькасць населеных пунктаў. Некаторая частка помнікаў аказалася ў цяжкадаступных месцах. Частка помнікаў прыйшла ў кепскі стан. Скарачаецца колькасць насельніцтва вёсак і частка з іх хутка перастане існаваць.

Значная частка з тых помнікаў і шыль, якую было запланавана ўзвесці не былі збудаваны. Іх няма ні ў "Зборы помнікаў" [3], ні ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі [2]. Наўрад ці атрымаецца усталяваць абяліскі, мемарыяльныя дошкі, курганы ў **113** вёсках раёна і 14 неадноўленых вёсках у памяць аб загінуўшых у баях за Радзіму земляках. Але ў кожным *цэнтры сельскага савета*, у *аграгарадках*, у *вёсках, дзе ёсць школы* яны павінны паўстаць. Іх не так шмат. Побач з такімі шыльдамі можна ўсталяваць інфармацыйныя стэнды з матэрыяламі. Большую частку інфармацыі варта размесціць у Інтэрнэце, на сайце, напрыклад, райвыканкама, а каля шыльды размяшчаць QR-код са спасылкай на патрэбныя старонкі.


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 571. Воп. 4. Спр. 185. Арк. 35–44.
2. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мн. : БСЭ, 1985. – 496 с.


**Юрчак Д. В.**

## УЛІКОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ АБ'ЕКТАЎ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК ГІСТАРЫЧНЫЯ КРЫНІЦЫ

На сённяшні дзень пытанне аховы культурнай спадчыны мае ўсё большае значэнне ў культурным жыцці Рэспублікі Беларусь. Гэта цалкам адпавядае агульнасусветным тэндэнцыям. Пры гэтым, у мэтах забеспячэння аховы разнастайных аб'ектаў культурнай спадчыны асаблівае месца адводзіцца іх дзяржаўнаму ўліку, што матэрыялізаваны ва ўліковых дакументах. Апошнія, на наш погляд, могуць складаць асобную групу гістарычных крыніц, якія неабходна аналізаваць і даследаваць у гістарычных і практычных мэтах. Па-першае, гэта дазволіць прасачыць асаблівасці развіцця і дынаміку падыходаў з боку дзяржавы да рэалізацыі на практыцы заканадаўства аб ахове культурнай спадчыны. Па-другое, аналіз і параўнанне разнастайных уліковых спісаў дадуць магчымасць выявіць недакладнасці ў дзеючым Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, тым больш, што на месцах спісы фарміраваліся часта вельмі паспешна і без прыцягнення навукоўцаў. А закладзеныя раней памылкі маглі пераходзіць з адных уліковых дакументаў у іншыя. З апошнім аўтар ужо не раз сутыкнуўся ў сваёй практычнай рабоце.



Рэпазіторый ВДУ

У межах дадзенай публікацыі мы паспрабуем акрэсліць аноўныя ўліковыя спісы, якія пачалі фарміравацца з сярэдзіны XX ст., прасачыць іх эвалюцыю як дакументаў афіцыйнага ўліку аб'ектаў спадчыны і адначасова гістарычных крыніц, якія варта дэталёва і глыбока вывучаць у практычных мэтах.

У пасляваенны час пытанню аховы культурнай спадчыны з боку ўлады была нададзена асаблівая пільная ўвага. Гэта ў першую чаргу тычылася ваеннай спадчыны, але распаўсюджвалася і на іншыя культурныя каштоўнасці. Згодна з пастановай Савета Міністраў СССР ад 14 кастрычніка 1948 г. № 3898 "О мерах улучшения охраны памятников культуры" была прынята пастанова Савета Міністраў БССР ад 19 снежня 1950 г. № 1629 "Об утверждении списков археологических и исторических памятников на территории БССР", якой былі зацверджаны спісы археалагічных і гістарычных помнікаў агульнасаюзнага і рэспубліканскага значэння. У спісе археалагічных помнікаў саюзнага значэння апынулася 8 аб'ектаў спадчыны, у аналагічным спісе гістарычных помнікаў – 24. Агульная колькасць археалагічных аб'ектаў рэспубліканскага значэння дасягнула 127, гістарычных помнікаў – 71 [3, с. 121–160].

У далейшым дадзены спіс быў дапоўнены пастановай Савета Міністраў БССР ад 26 жніўня 1957 г. № 538 "Об утверждении дополнительных списков археологических и исторических памятников, находящихся на территории БССР". На гэты раз у рэспубліканскі спіс, што змяшчаўся ў дадатку да пастановы, было дадаткова ўключана 483 гістарычных і 131 археалагічных помнікаў [3, с. 161–276].

Пры аналізе гэтых уліковых дакументаў варта ўлічваць істотныя змяненні ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле БССР, якія адбыліся з 1950-х гг. уключаючы знікненне асобных абласцей, раёнаў і сельсаветаў, змяненне межаў асобных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, назваў населеных пунктаў, а таксама той факт, што некаторыя з вёсак за гэты час перасталі існаваць.

Яшчэ адной важнай спробай стварэння агульнарэспубліканскага збору помнікаў гісторыі і культуры, які б абапіраўся на змены, што былі ўнесены за гэты час ў заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, стала пастанова Савета Міністраў БССР ад 18 лютага 1988 г. № 32. Дадаткі да гэтай пастановы, ў якіх змяшчаліся спісы помнікаў гісторыі і культуры, былі выдадзены ў двух тамах у 1990 г. [5]. Да гэтай публікацыі, асабліва ў пытаннях лакалізацыі аб'ектаў таксама варта ставіцца крытычна. Напісанне асобных населеных пунктаў можа не супадаць з арыгіналам, што тлумачыцца як праблемамі перакладу, так і наборам тэкстаў першасных уліковых дакументаў машыністкамі.

Акрамя агульнарэспубліканскага на месцах вёўся ўлік помнікаў рэгіянальнага значэння. У Віцебскай вобласці спіс помнікаў па стане на 1988 год і копіі прынятых рашэнняў, якімі быў зацверджаны гэты спіс, захоўваецца і зараз у бягучым архіве ўпраўлення культуры аблвыканкама [напрыклад, гл. 4]. Гэта крыніца карысна тым, што акрамя надрукаванага тэксту ў ёй маецца шмат рукапісных паправак і заўваг, якія дадаткова дазваляюць звярнуць увагу на існуючыя раней у тэкстах уліковых дакументаў памылкі, абдрукі і недакладнасці.

Не гледзячы на наяўнасць вышэйпералічаных уліковых дакументаў, найбольш аўтарытэтным выданнем, падрыхтаваным у 1980-я гг. Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР стала шматтомнае выданне Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. У кожны том уключаліся аб'екты спадчыны, якія ўзяты на ўлік і пад ахову, ці на думку даследчыкаў павінны набыць афіцыйны статус помнікаў. Асобны том прысвечаны Віцебскай вобласці быў выдадзены ў 1985 годзе [1]. Але досвед карыстання гэтай крыніцай паказвае, што і ў ёй сустракаюцца памылкі.

Спіс помнікаў гісторыі і культуры, закладзены ў савецкія часы, дзейнічаў і ў Рэспубліцы Беларусь. Праца над новым Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей – Дзяржаўны спіс) вялася вельмі павольна. У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2001 г. № 1383 аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму было рэкамендавана да 1 студзеня 2002 г. адмяніць усе рашэнні аб зацвярджэнні спісаў помнікаў гісторыі і культуры мясцовага значэння. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2003 года № 1141 быў адменены савецкі спіс помнікаў гісторыі і культуры рэспубліканскага значэння. Пры гэтым пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2003 года быў створаны новы Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [2], які пасля прыняцця новага закона быў зацверджаны Пастановай Савета Міністраў (упершыню ў 2007 г.) і дзейнічае да цяперашняга часу (актуальная версія размешчаная на адмысловым электронным рэсурсе http://gosspisok.gov.by/).

Якую карысць можна атрымаць, правёўшы аналіз часткі названых уліковых дакументаў, якія ўжо сталі гісторыяй і могуць выступаць гістарычнымі крыніцамі? Па-першае, іх аналіз дае магчымасць звярнуць увагу на не ўлічаныя ў дадзены момант аб'екты спадчыны. Напрыклад, у спісе аб'ектаў агульнасаюзнага значэння 1950 г. на тэрыторыі Полацкага раёна Віцебскай вобласці можна сустрэць магілу Я.Кульнёва (сам ён перапахаваны, але помнік як твор манументальнага мастацтва застаўся), якая на дадзены момант не мае статусу гісторыка-культурнай спадчыны, а дакументы на прысваенне гэтага статусу толькі былі пададзены ў 2021 годзе. Таксама зараз не з'яўляецца каштоўнасцю і так званы "Літоўскі вал" (былая мяжа Рэчы Паспалітай і Расіі), які з 1957 года як помнік

Рэпазіторый ВДУ

археалогіі меў рэспубліканскае значэнне, а з 1987 г. – рэгіянальнае. Падрабязны аналіз крыніцы па іншых рэгіёнах таксама, на наш погляд, можа дапамагчы "выявіць" не ўлічаныя на дадзены момант культурныя каштоўнасці.

Па-другое, параўнанне розных уліковых спісаў дазваляе прасачыць эвалюцыю змянення значэння асобных аб'ектаў спадчыны, якія, як названы вышэй "Літоўскі вал", чамусьці неапраўдана паніжалі свой ахоўваемы статус. Гэта дазваляе звярнуць ўвагу на неабходнасць павышэння катэгорыі некаторых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Прыклад падобных "павышэнняў" на сённяшні дзень маецца і ў Віцебскай вобласці. Доўгі час у дзеючым Дзяржаўным спісе былы Друцкі дзядзінец, які атрымаў статус помніка археалогіі агульнасаюзнага значэння разам з Полацкам яшчэ ў 1950 г., быў пазначаны як "гарадзішча" і меў да нядаўняга часу толькі катэгорыю "3" (рэгіянальнага значэння). Толькі ў 2020 годзе па ініцыятыве Віцебскага абласнога савета па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны атрымалася ўнесці папраўкі ў Дзяржаўны спіс, уключыўшы ў склад каштоўнасці ўвесь комплекс умацаванай частцы горада разам з дзядзінцам і вакольным горадам, а таксама павысіць статус аб'екта да катэгоры "1" (міжнароднага значэння). Тое ж самае варта зрабіць і з былымі замкамі старажытнага Полацка і некаторымі іншымі аб'ектамі спадчыны.

Па-трэцяе, аналіз розных уліковых спісаў, іх параўнанне з навуковымі публікацыямі і фактычнымі дадзенымі могуць даць магчымасць удакладніць лакалізацыю ўлічаных на дадзены момант аб'ектаў у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. У якасці прыкладу можна прывесці сітуацыі з лакалізацыяй помнікаў археалогіі ў Віцебскім раёне. Так гарадзішча ля в. Зайцава ў Зборы помнікаў было памылкова аднесена да Лятчанскага сельскага савета [1, с. 187]. У той жа час як у рэгіянальным савецкім спісе аб'ект быў прывязаны да зямель Янавіцкага пасялковага савета [4, л. 59]. А з улікам таго, што вёска Зайцава пад Янавічамі знікла, памылка была перанесена і ў Дзяржаўны спіс. Толькі прывязка да р. Каспля, на беразе якой знаходзіцца гарадзішча, дала магчымасць выправіць памылку ў 2011 годзе і ўнесці змены ў прывязку помніка археалогіі, які цяпер адносіцца афіцыйна да бліжэйшай в. Лёпіна.

Памылкі з лакалізацыяй ў Віцебскім раёне ў 2020 годзе прыйшлося выпраўляць і ў адносінах да селішча і гарадзішча, якія былі прывязаны да в. Шапуры, але фактычна знаходзіліся на тэрыторыі в. Сялюты. Пра апошняе сведчыць само апісанне помнікаў у "Зборы помнікаў": "*на правым беразе р. Лучоса, на гары вышынёй 20 м., за 0.3 км на ўсход ад інтэрната інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны*" [1, с. 200]. Такая прывязка ніяк не адносілася да в. Шапуры, якая знаходзіцца на значнай аддаленасці ад р. Лучоса. Акрамя таго, інтэрнат размешчаны менавіта ў в. Сялюты, а дакладнае размяшчэнне аб'екта, добра вядомае спецыялістам раённага музея, дало магчымасць прывязаць яго ў Дзяржаўным спісе да дома № 2 па вул. Лучоскай у в. Сялюты.

Падобныя прыклады яскрава сведчаць, што грунтоўны аналіз і вывучэнне ўліковых спісаў культурных каштоўнасцей можа не толькі адлюстраваць дынаміку падыходаў да пытання захавання аб'ектаў спадчыны, але і мець важнае практычнае значэнне для аптымізацыі і ўдакладнення дзеючага Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей, што створыць надзейны падмурак для захавання нашай спадчыны для наступных пакаленняў.


1. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1985. – 496 с.
2. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, 2020. – Рэжым доступу: http://gosspisok.gov.by/. – Дата доступу: 17.03.2021.
3. Советское законодательство о памятниках истории и культуры : сборник документов и материалов (1917–1972 гг.). – Мінск : Полымя, 1972. – 430 с.
4. Список памятников археологии 1988 г. // Текущий архив управления культуры Витебского облисполкома. – 72 л.
5. Список памятников истории и культуры республиканского значения Белоруской ССР : в 2 кн. – Мінск : БелЭН, 1990.


**Киенко Д. Г.**

## ИСТОЧНИКИ ИССЛЕДОВАНИЯ МЕСТА ПАДЕНИЙ САМОЛЕТОВ И СУДЕБ ЛЕТЧИКОВ: ИЗ ОПЫТА НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОЙ ГРУППЫ ВОЕННОЙ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ «РУБОН»

Проблемой реконструкции событий, связанных с участием авиации в боевых действиях на территории Беларуси в начале Великой Отечественной войны, является практически полное отсутствие документальных свидетельств о боях приграничных авиадивизий. В таких условиях важное значение приобретают комплексные исследования, включающие в себя выявление и анализ максимального количества документальных источников (советских и немецких), проведение полевых исследований в местах дислокации авиационных частей и падения самолетов.

Единственным свидетельством гибели самолета зачастую является запись в документе «не вернулся с боевого задания». Поэтому установленное место падения самолета и факта гибели

Репозиторий ВГУ